6. Книгоиздание Беларуси в 2016 году [Электронный ресурс]. — URL: http://natbook.org.by/assets/files/druk_belarusi/2016/knigoizdanie-2016.pdf

УДК 821.161.3

Н. В. Заяц, дац., канд. філал. навук
(БДПУ, г. Мінск)

## «ВЕРТЫКАЛЬНЫЯ РЭКІ СВЯТЛА»: АНОНС НЕВЫДАДЗЕНАЙ КНІГІ ВАСІЛЯ ЗУЁНКА

Мастакоўскі набытак сучаснага пісьменніка В. Зуёнка прадстаўлены творамі самых розных жанраў: лірыкай, паэмамі, празаічнымі эсэ і эцюдамі, перакладамі з іншанацыянальных літаратур, літаратурна-крытычнымі нататкамі... Шматгранны плён майстра слова выдаваўся пераважна ў савецкія часы; у новую эпоху пабачылі свет толькі празаічныя тэксты «Паміж небам і зямлёй» («Беларуская навука», 2009), «Выбраныя творы» («Кнігаз-бор», 2010), збор ранейшага плёну «Азірнуўшыся не скамянець...» («Мастацкая літаратура», 2013), што выйшаў у серыі «Беларуская паэзія XX стагоддзя». Па-за выданнямі застаецца велізарны корпус мастацкіх твораў, напісаных у канцы XX–XXI стагоддзі.

Так, прадстаўнічым не толькі якасна, але і колькасна (больш за 400 старонак) атрымаўся рукапіс зборніка «Вертыкальныя рэкі святла», які склалі «вершы сутоку тысячагоддзяў». Кніга структуравана па храналагічным прынцыпе: раздзел «Рэчышча-1» змяшчае вершы 1993–2000 гг., «Рэчышча-2» — творы 2001–2006 гг. У мастацкіх тэкстах гарманічна і ўзаемадапаўняльна суіснуюць прыватнае і агульназначнае, будзённае і быційнае, зямное і касмічнае, імгненнае і вечнае. Усё гэта паяднана дзякуючы выключнасці творчай асобы аўтара, яго прыроднаму таленту, літаратурнаму вопыту, мастакоўскай харызме і вялікай патрабавальнасці да сябе як да паэта. У вершах В. Зуёнка навідавоку неабходны сінтэз агульнага і канкрэтнага, гарманічная сувымернасць зместу і формы, невытлумачальная сіла эмацыйнага ўздзеяння, што вызначаюць сапраўдную творчасць і дазваляюць называць аўтара майстрам слова.

У новых творах выяўляецца своеасаблівы першасна-пачуццёвы касмаганізм мыслення В. Зуёнка: мастак імкнецца зразумець сутнасць прыроды, космасу, сусвету — зразумець і пака-

заць іншым. Зрэшты, гэта азначэнне (касмаганізм) вельмі ўмоўнае: зуёнкаўская паэзія не паддаецца катэгарычнай ідэнтыфікацыі і супраціўляецца размежаванню яе на складнікі. Даследчыкі адзначалі то анімістычны, амаль што паганскі погляд В. Зуёнка на свет, то заўважалі ў яго лірыцы элементы навуковага пазнання, то звярталі ўвагу на праявы рэлігійна-хрысціянскага светапогляду... У сучасных вершах прыкметы, якія дамінавалі на розных этапах творчасці, суіснуюць і ўзаемаадцяняюць адна адну, засведчыўшы новую ступень спасціжэння быцця паэтам:

Вертыкальныя рэкі святла,
Ад сузор'яў — сухія Гальфстрымы.
І мая крынічка цякла
Праз мільярды гадоў нястрымна —
Покуль стала душою маёй,
Словам, песняй, трывогай, загадкай…
…Як не будзе мяне — над зямлёй
Ці пабачыце зорку, нашчадкі?..

Працытаваныя радкі эпіграфа да кнігі «Вертыкальныя рэкі святла» выяўляюць глабальнае самаадчуванне лірычнага героя, які ў В. Зуёнка амаль заўсёды тоесны асобе аўтара, — як часцінкі сусвету. Найперш гэта датычыць твораў натурфіласофскай лірыкі, дзе трыяда «прырода — космас — бог» ва ўзае-мадачыненні з чалавекам выступае адзіным і непадзельным аб'ектам мастацкага даследавання, прымiраючы паганства, навуку і рэлігію. Аднолькавая ўвага да самых простых з'яў і да сусветных пытанняў з самага пачатку адрознівала паэзію В. Зуёнка. Пісьменніцкі позірк выхоплівае з безлічы жыццёвых праяў незаўважныя для іншых дробязі, паказваючы значнасць і каштоўнасць кожнай з іх: «Што імклівы палёт сусветаў / Перад гэтым зярняткам малым! — / І ў каго больш загадак-сакрэтаў / У нябесным быцці і ў зямным? / Хай — як Бог неспасціжнасць галактык / Будзе вечна душу ахінаць, / Але веліч малога зярнятка / Толькі смерцю можна пазнаць. / Знакаў роўнасці не шукаю, / Ды зярнятка сягае далей / За сусвет, бо калі памірае — / Колькі жыццяў яно дае?!» («Што імклівы палёт сусветаў…»). Паэтычны свет В. Зуёнка цесна знітаваны са светам жывой, зменлівай прыроды, якая адначасова ўспрымаецца і як таямніца, як разумны, раўназначны

суразмоўца і сябар: «Рабіна — / Восені рыбіна / Чырвонапёрая — / Трапеча ў імглістай стыні. <...> / З табой мы / Горкай часінаю, / Блуднай, знявечанай, / Ратуемся разам ад ліха: / Ты боль мой / Спагадай рабінавай, / Я твой — чалавечаю / Ціха вылечваю…» («Рабіна…»).

В. Зуёнак не замыкаецца на філасофскіх развагах аб прыродна-касмічных з'явах і пазачасавых пытаннях, сузіранні і рэфлексіі — праблемна-тэматычны дыяпазон кнігі даволі шырокі. Да прыкладу, «рэчышча» грамадзянскай лірыкі па напоўненасці не саступае натурфіласофскаму. Тут шырока прадстаўлены вершы, дзе ўздымаюцца праблемы гістарычнага бяспамяцтва, нацыянальнай непраяўленасці, бязмоўнасці народа, даследуецца стан краіны ў перыяд духоўна-сацыяльнага хаосу мяжы тысячагоддзяў. Сярод іншых тэм і матываў звяртае на сябе ўвагу інтэрпрэтацыя паэтам купалаўскага матыву чакання прарока. У многіх творах («Адкуль прарокі ў нас…», «Каб верылі…», «Хочацца музыкі светлай…»), якія па вастрыні і сіле гучання не саступаюць вершам класіка. Па В. Зуёнку, вялікая бяда і сённяшняй Беларусі — адсутнасць нацыянальнага прарока, здольнага нарэшце раскрыць вочы людзям, абудзіць душы, дапамагчы пазбавіцца комплексу непаўнавартаснасці. Мастацкае ўвасабленне гэтага вобраза часта ажыццяўляецца з арыентацыяй на творчасць Купалы. Так, гіпертэкставыя адсылкі да яго спадчыны адчувальныя ў вершах «Сыне Божы, Хрыстос Ісусе...», «Мы — у цэнтры, не на ваколіцы...» і інш. Некаторыя творы на гэтую тэму ўяўляюць сабою алюзіі на «малітвы» Купалы («Мая малітва»: «Я буду маліцца і сэрцам, і думамі...», «Ва ўсяку мінуту, ва ўсякай патрэбе...»). Так, верш «Сыне Божы, Хрыстос Ісусе...» нават адкрываецца эпіграфам «Паўстань з народа нашага, прарок...». В. Зуёнак звяртаецца да Бога з пакутнай просьбай выратаваць Беларусь, падараваць ёй сапраўднага Месію: «Сыне Божы, Хрыстос Ісусе, / Ці ты нас не пабачыў здалёк, / Што да грэшнай маёй Беларусі / Не дайшоў ні адзін твой прарок?... <...> / Божа светлы, Божа адзіны, / Дай хоць сёння нам ласку сваю: / У імя пакутнай Радзімы, / Дай нам, Божа, прарока, — малю».

Разам з тым паэт бачыць, што беларус застаецца ўсё такім жа пасіўным, інертным, абыякавым да сябе самога, да сваёй будучыні, і гэта нараджае змрочныя настроі і матывы расчаравання: «Будзе новы дзень — і далёкія / Не паклічуць нас небасхілы. / Нашы крылы растануць аблокамі, / Мы — гарбатыя, як магілы. / Будзе зноў

кумір новаспечаны / Нас прымерваць да ўласнага кроку. / А бяда наша — звышчалавечая: / Беларусь не чакае прарока...». Вобраз самога паэта ўзвышаецца, яго слова гучыць важка, прароча, як запавет. Творчасць, такім чынам, перастае быць толькі мастацтвам і ператвараецца ў служэнне, місію: ідэйны змест многіх вершаў падпарадкаваны вырашэнню мастацкай (і — шырэй — грамадзянскай) задачы абуджэння нацыі («Надпіс на кнізе», «Калі адбяруць радзіму…», «Каму спяваю і заву каго…»). Аднак нават у вершах грамадзянскай лірыкі, сама прырода якой прадугледжвае пафаснасць і палемічны запал, В. Зуёнку ўдаецца не ўпадаць у рыторыку, заставацца па-жыццёваму мудрым і разважлівым.

Рукапіс кнігі «Вертыкальныя рэкі святла» атрымаўся канцэптуальна-цэласным, прадуманым у ідэйна-зместавых і фармальных адносінах. Падрыхтаваныя пісьменнікам да друку «вершы сутоку тысячагоддзяў» чакаюць свайго выдаўца.

УДК 808.2:821.161.3-343.4-93

Д. П. Зылевич, доц., канд. филол. наук
(БГТУ, г. Минск)

## ОСОБЕННОСТИ БРЕНДИНГА В КНИГОИЗДАНИИ ДЛЯ ДЕТЕЙ

Современные реалии книжного рынка вынуждают специалистов издательской сферы задумываться над возможностями использования технологии брендинга. В издательском деле опыт применения данной технологии еще небогат, в других же сферах жизнедеятельности человека, в первую очередь в сфере производства товаров, брендинг существенно влияет на продажи. Следовательно, умело применяя технологию брендинга с учетом специфики своей отрасли, издатель может формировать предпочтения читателей, а значит рассчитывать на повышение продаж и снижение рисков.

По сравнению с литературой для взрослых детское книгоиздание с точки зрения использования брендов выглядит более насыщенным. Книги о Гарри Поттере, Лунтике, Смешариках или Маше с Медведем есть почти в каждой семье. И, безусловно, эти персонажи являются брендами.